# Месца еднасці навукі і інтузіязму

**Аутобус па маршруце Мінск — заказнік "Днепра-Сожскі" адпрауляецца з раніцы. Аматарау прыроды, якія збіраюцца у вандроуку, ад звычайных пешаходау города адрозніваюць вялікія паходныя заплечнікі і прылады для малявання. Усіх аб'ядноувае агульная мэта — расказаць пра адукацыйныя магчымасці запаведнай тэрыторыі.**

Трансгранічны праект “Адукацыйны турызм у рэгёнах з прыродным запаведнымі зонамі у Польшчы і Беларусі” пачауся у 2019 годзе. Яго галоуная мэта — развіваць адукацыйны турызм на тэрыторыях Днепра-Сожскага біялагічнага заказніка і Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка (на тэрыторыі Беларусі), а таксама запаведных тэрыторый у верхняй даліне ракі Нарэу (у Польшчы). Спецыялісты Беларускага зялёнага крыжа сумесна з вучонымі і краязнауцамі распрацавалі некалы турыстычных маршрутау па знакавых мясцінах ахоуваемых зон.

У распрацоуцы маршрутау па Днепра-Сожсюм заказніку дапамагалі навукоуцы Андрэй Лебедзеу і Анатоль Углянец, краязнавец Іван Осіпау. Адна са сцяжын пралягае такім чынам, каб вандронікі маглі убачыць Днепр і Сож, геалагічны помнік рэспублканскага значэння — агаленне “Лоеу”. Кажуць, што падобнае агаленне можна сустрэць толькі у Аргенціе, бо у слаях адкладанняу тут захаваліся рэшткі выкапневых расллін, імхоу і лішайнікау, якія памятаюць ледніковы перыяд.

Па словах вучоных, на тэрыторыі заказніка жыве больш за 140 відау птушак, 22 з якіх — рэдкія або знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Вандруючы па Днепра-Сожскім заказніку, можна убачыць вяртлявую камышоуку, чорнага і чырвонага каршуноу, арлана белахвоста (найбуйнейшы крылаты драпежнк, які гняздуецца у Беларусі). Таксама тут можна спаткаць белую чаплю, зімародка, чорнага бусла, шэрага журауля і іншых птушак. А недалёка ад вёскі Абакумы Лоеускага раёна знаходзяцца рэшткі эпохі неаліту і курганны могільнік экохі Старажытнай Русі. Асабліваю прыродную каштоунасць уяуляюць папуляцыі матылькоу. Сярод іх — стракатка Сапфо (больш за стагоддзе лічылася страчанай), зярэнтыя паліксэна (адззін з самых прыгожых матылькоу Еуропы, які знаходзіцца пад пагрозай знікненя) і самы вялікі матылёк у Беларусі — махаон.

Для удакладнення вузкаскіраваных пытанняу, да праекта далучыліся этнамолаг, батанік і арнітолаг. Вучоныя змогуць расказаць пра заказнік з пункта гледжання іх даследаванняу. Для таго каб папулярызаваць запаведныя зоны, арганізатары праекта робяць турыстычна-рабочыя выезды, у якіх удзельнічаюць мастакі і фатографы. Таксама у турах прымаюць удзел валанцёры: яны жывуць у намётах і запауняюць пуцявыя дзённікі. Іх нататкі таксама змогуць быць выкарыстаны для знаёмства з запаведны- мі тэрыторыямі, бо па выніках паездак рыхтуюцца спецыялізаваныя выставы.

Анатоль Кулак працуе у Навукова-практычным центры НАН па біярэсурсах.

Даследчык вывучае разнастайнасць насякомых і у заказнік прыязджае ужо не першы год.

— Тэрыторыя заказніка — унікальная, яе абкружаюць дзве рэчкі з поудня, поуначы і усходу. Відавочна, што для захавання прыродных рэсурсау тут павінна весціся моцная прыродаахоуная палітыка, — пераканавведены Анатоль Вктаравіч. — У мінулым годзе у заказнік усялялі вялікага дубовага вусача, які, акрамя таго, што занесены у міжнародную і беларускую Чырвоную кнігу, з’яуляецца самым вялікім жуком у Беларусі. У краіне ёсць толькі некалькі месцау, дзе жыве насякомае: Нацыянальны парк “Прыпяцкі”, заказнік “Сярэдняя Прыпяць” і альманскія балоты.

У рабоце над праектам таксама задзейнічаны напрацоукі іншых ініцыятыу Беларускага зялёнага крыжа. Так, праект “Дняпроускі паром” дапамог з наладжваннем сувязей з музеямі найбліжэйшых раёнау, “Школьны сад”

паспрыяу папулярызацыі ідэі сярод зацікауленых настаункау.

— Шкада, што не існуе адзінай пляцоукі, дзе б акамуляваліся веды, атрыманыя падчас праектау на запаведных тэрыторыях. Цікавасць да іх неаднойчы выказвалі Лоеуская раённая бібліятэка і Лоеускі музей бітвы за Днепр, — зауважае адна з каардынатарау праекта Наталля Святкіна. — Супрацоунікі музея сумесна з Днепра-Сожсюм заказнікам у будучыні нават плануюць праводзіць экскурсіі па распрацаваных маршрутах.

У дадатак да усяго, спецыялісты Беларускага зялёнага крыжа распрацоуваюць адукацыйныя гульні, якія аб'ядная серыя "Падарожжы па сельскай Беларусі". Ужо зараз іх тэсціруюць педагогі. Падобныя гульні змогуць выкарыстоувацца настаунікамі і вы- кладчыкамі краіны, каб пазнаёміць вучняу і студэнтау са спадчынай заказніка і запаведніка.

Комплекс мерапрыемствау праекта паспрыяе папулярызацыі навуковых даследаванняу, якія праводзяцца на ахоуваемых тэрыторыях. А заключным этапам ініцыятывы стане правядзенне міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай выкарыстанню магчымасцыей адукацыйнага турызму для папулярызацыі тэрыторый з асаблівым статусам.

Беларускі зялёны крыж супрацоунічае з арганізацыямі Лоеускага, Брагінскага і Хойніцкага раёнау больш за 25 гадоу. Спачатку у полі зроку аргаізацыі былі праблемы, звязаныя з чарнобыльскай катастрофай, цяпер — наступствы сацыяльнай занядбанасці гэтых тэрыторый. Каардынатары праекта перакананы, што адрадзіць цікавасць да гэтых мясцін дапаможа адукацыйных турызм. Паспрыяе гэтаму і адметнасць ініцыятывы: у адукацыйных мэтах адначасова будуць задзейнічаны гістарычна-культурная і прыродная спадчына мясцовасці. Каманду, якая працуе над прасоуваннем ініцыятывы, натхняе прыклад балота "Ельня", папулярызацыя і развіццё якога пачалося з групы энтузіястау.

Падчас апошняй паездкі удзельнікі камунікавалі з этнамолагам, геолагам і краязнауцам. Вандроунікі збіралі гербарый імхоу і лішайнікау, сачылі за начным ловам матылькоу і дзяліліся уражаннямі. Дзякуючы гэтаму, у арганізатарау нарадзілася думка ладзіць на тэрыторыі Днепра-Сожскага заказніка штогадовы фестываль з майстар-класамі па вывучнні насякомых. Таксама камандзе арганізатарау хацелася б зрабіць начное назіранне за матылькамі традыцыйным мерапрыемствам: каб у адным месцы сабраліся навука і энтузіясты, якім блізка тэма экалогіі і адукацыйнага турызму.

— Мы (імкнёмся далучыць да праекта як мага больш зацкауленых людзей з вышэйшых навучальных установу. У краіне адбываецца шмат падзей у нашым напрамку, але пра іх ведаюць нямногія. Хацелася б, каб пасля нашага праекта засталося нешта для тых, хто будзе развіваць тэты напрамак у будучыні — у бібліятэках, музеях, навучальных установах, — падагульняе Наталля Святкіна. — Рэгулярныя адукацыйныя туры па гэтых мясцінах — патрэба. Такія паездкі не пашкодзяць прыродзе і змогуць звярнуць увагу на каштоуныя рэсурсы, знікненне ці істотнае змяненне якіх можа прывесці да непапраўных наступствау.

Ірына ІВАШКА

**Источник:** Настауніцкая газета. – 2021. – 19 чэрвеня (№68). – С. 14